Created in Master PDF Editor - Demo Version

ISSN 1993-1999

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3 2009

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ
Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

69/0.

3 (116)
сакавік

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 411 ад
28 чэрвеня 1996 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускае таварыства «Веды»

Рэдакцыйная калегія:

Галоўны рэдактар Васіль Кушнер

Сымон Барыс (рэдактар аддзела), Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч (намеснік галоўнага рэдактара), Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер (рэдактар аддзела), Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

Рэдакцыйная рада:

Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Бохан (старшыня рады), Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Мірановіч, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцава, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ

### САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксандр Рытаў — Фарміраванне новай сацыяльнай іерархіі ў БССР у 1920-я гады: адукацыйны аспект — 3

### ГІСТОРЫЯ РЭЛІГІІ

Уладзімір Лобач — Свет людзей і свет багоў: прастора ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў — 12

Таццяна Прадко — Эвалюцыя рэлігійнага сінкрэтызму на Беларускім Палессі — 18

### КРАЯЗНАЎСТВА

Леанід Акаловіч, Ігар Гатальскі, Інеса Кароль — Гістарычны нарыс вёскі Прылукі — 25

### ЛЮДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

Міхаіл Стралец, Святлана Пціцкіна — Нястомны працаўнік навукі *(Да 70-годдзя з дня нараджэння Эмануіла Рыгоравіча Іофе)* — 37



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version


**МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЎРОКАЎ**

Ларыса Вансовіч — Рэспубліка Беларусь на шляху стабілізацыі *(XI, XI' класы)* 43

**МЕТОДЫКА. ВОПЫТ**

Ніна Яруціч — Рабаўладальніцтва ў Рыме і паўстанне Спартака *(V клас)* 57

Ірына Стасюк — Эканамічнае становішча БССР у другой палове 1960-х— першай палове 1980-х гг. *(IX' клас)* 59

Венера Вагановіч — Рэспубліка Беларусь у сусветным супольніцтве *(IX, IX' класы)* 65

Алена Ефімовіч — Станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь *(XI, XI' класы)* 69

**РЭЦЭНЗІІ**

Леанід Лыч — Бацькаўшчыне вернутае імя 74

**НАВУКОВАЕ І ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ**

Вячаслаў Даніловіч, Ігар Язэпенка — Археалагічная навука: стан, метадалогія, перспектывы *(да 100-годдзя адкрыцця Мінскага царкоўна-археалагічнага музея)* 76

Содержание 79

Summary 80



*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 04.07.2005 г. № 101 «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, педагагічных, філасофскіх і юрыдычных навуках, а таксама ў адпаведнасці з загадам ад 05.10.2005 г. № 143 — па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*



***Адрас рэдакцыі:* *220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакой 402; 220050, Мінск, вул. Ленінградская, 14, пакой 707. Тэлефоны: (017) 284-02-20, 209-54-63; факс: 284-02-20.***

**http:// aiv.by; e-mail: aiv@aiv.by, bhc@aiv.by.**



**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**

Падпісана да друку 16.03.2009 г.

Выхад у свет 26.03.2009 г. Афсетны друк.

Фармат 60x84$^{1}/_{8}$.

Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.

Наклад 1 684 асобнікі. Зак. 0535.

*Надрукавана ў друкарні РУП «Прамдрук».*

*Ліцэнзія № 02330/0148775 ад 30.04.2004 г.*

*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


**Да ведама аўтараў!**

**За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экземплярах (пажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), дакладны адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.**

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэмы.

© **«Беларускі гістарычны часопіс», 2009.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version




Алена ЕФІМОВІЧ

# Станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь

*XI, XI' класы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта ўрока:** дапамагчы вучням выявіць асаблівасці палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь у перыяд станаўлення яе суверэнітэту.

**Задачы ўрока:**

*навучальная:* вызначыць прычыны, сутнасць і асаблівасці палітычных рэформ у перыяд станаўлення суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

*развіваючыя:* садзейнічаць развіццю творчых і аналітычных здольнасцей вучняў пры рабоце з гістарычнымі дакументамі, актывізаваць іх пазнавальную дзейнасць;

*выхаваўчыя:* садзейнічаць выхаванню ў вучняў патрыятычнага стаўлення да сваёй дзяржавы, паглыбіць уяўленне вучняў пра ролю асобы ў гісторыі і палітычнай дзейнасці.

**Тып урока** — вывучэнне новай тэмы.

**Форма заняткаў** — групавое і індывідуальнае навучанне, прэс-канферэнцыя.

**Забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст.— 1999 г.: Вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / Пад. рэд. Я.К.Новіка. Мн., 2002; Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст.—2002 г.: Хрэстаматыя: 11-ы кл.: Вучэб. дапам. для вучняў / Пад рэд. Я.К.Новіка. Мн., 2003; палітычная карта СССР; дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь; партрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.). Мн., 2006; мультымедыйныя сродкі.

**Асноўныя паняцці:** *перабудова, суверэнітэт, дэнансацыя, ратыфікацыя, рэферэндум, канстытуцыя, прэзідэнт, дзяржаўная сімволіка, палітычная сістэма.*

**Асобы:** *М.Гарбачоў, Б.Ельцын, С.Шушкевіч, Л.Краўчук, М.Грыб, А.Лукашэнка, В.Кебіч, А.Дубко, З.Пазняк, В.Новікаў.*



*ЕФІМОВІЧ Алена Васільеўна — дацэнт кафедры паліталогіі і права БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат гістарычных навук. Нарадзілася ў в. Мілевічы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Закончыла БДУ ў 1999 г. Выкладала гісторыю ў СШ № 32, СШ № 126, у гімназіі № 3 Мінска, у Мінскім вышэйшым радыётэхнічным каледжы.*



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

**Даты:**

*27 ліпеня 1990 г.* — прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР;

*25 жніўня 1991 г.* — прыняцце закона "Аб наданні статусу Канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі";

*8 снежня 1991 г.* — дэнансацыя дагавора 1922 г. пра ўтварэнне СССР і спыненне яго існавання;

*15 сакавіка 1994 г.* — прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

*10 ліпеня 1994 г.* — абранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

*14 мая 1995 г.* і *24 лістапада 1996 г.* — першы і другі рэспубліканскія рэферэндумы ў Беларусі.

**Падрыхтоўчы этап.** За два тыдні вызначыць вучня, які будзе "прадстаўляць" Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на прэс-канферэнцыі, астатніх вучняў размеркаваць на чатыры групы, якія будуць "прадстаўляць" тры галіны ўлады ў Рэспубліцы Беларусь і прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Даць вучням заданні.

**Заданні**

*Вучань*, які будзе "прадстаўляць" Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, павінен падрыхтаваць адказы на наступныя пытанні:

Якім патрабаванням павінен адпавядаць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, каб быць абраным Прэзідэнтам?

На які тэрмін выбіраецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь?

Якія паўнамоцтвы па Канстытуцыі належаць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь? *(Раздзел IV, глава 3.)*

*Першая група* вучняў будзе "прадстаўляць" Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Яны павінны падрыхтаваць адказы на наступныя пытанні:

На колькі гадоў выбіраецца Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь?

Якім патрабаванням павінны адпавядаць грамадзяне, каб яны маглі стаць дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў?

Якім чынам ствараецца Савет Рэспублікі?

Якія паўнамоцтвы маюць Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі? Чым адрозніваюцца іх паўнамоцтвы? *(Раздзел IV, глава 4.)*

*Другая група* вучняў, якая будзе "прадстаўляць" Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, павінна адказаць на наступныя пытанні:

Якім чынам фарміруецца Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь?

Якія паўнамоцтвы належаць ураду Рэспублікі Беларусь? *(Раздзел IV, глава 5.)*

*Трэцяя група* вучняў "прадстаўляе" судовую ўладу. Са свайго складу яны *(з дапамогай настаўніка)* вылучаюць прадстаўнікоў Канстытуцыйнага Суда, Вярхоўнага Суда, Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь і рыхтуюць адказы на пытанні:

Хто і якім чынам фарміруе судовыя органы?

Якія патрабаванні прад'яўляюцца да грамадзян, якія прэтэндуюць на пасады ў вышэйшыя судовыя органы?

На колькі гадоў назначаюцца суддзі?

Якія паўнамоцтвы маюць прадстаўнікі судовай улады па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? *(Раздзел IV, глава 6.)*

Вучні *чацвёртай групы* будуць выконваць ролю журналістаў. Яны павінны падрыхтаваць пытанні на падставе Канстытуцыі *(раздзела IV)*, адказы на якія павінны раскрываць сутнасць палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь. *(Настаўнік загадзя правярае падрыхтаваныя пытанні і, калі неабходна, дапамагае вучням правільна сфармуляваць іх.)*

**План урока**

**I.** Распад СССР і абвяшчэнне незалежнасці Беларускай ССР.

**II.** Рэфармаванне палітычнай сістэмы.

**III.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. Увядзенне прэзідэнцкай формы кіравання.

**IV.** Вынікі рэспубліканскіх рэферэндумаў 1995 і 1996 гг.

**V.** Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2001 і 2006 гг.

**Ход урока**

**Уступнае слова настаўніка.** Тэма сённяшняга ўрока *"Станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь"*. Разглядаючы гэты працэс, мы правядзём прэс-канферэнцыю з "прадстаўнікамі" вышэйшых органаў улады нашай дзяржавы, у ролі якіх будуць выступаць нашы вучні. Мы разгледзім працэс станаўлення беларускай дзяржавы пасля Кастрычніцкіх падзей 1917 г. і даведаемся пра яе стан на сучасным этапе.

I. *Праводзіцца гутарка з вучнямі па пытаннях:*

1. Калі была прынята Трэцяя Устаўная грамата БНР? У чым яе сутнасць?

2. Калі і пры якіх абставінах была абвешчана Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі *(ССРБ)*?

3. Калі і пры якіх абставінах узнікла дзяржава СССР?

4. Якая ўнутрыпалітычная сітуацыя склалася ў СССР у канцы 1980-х гг.?

5. Да чаго прывялі падзеі, якія адбыліся ў Маскве 19—21 жніўня 1991 г.?

6. Калі Вярхоўны Савет БССР абвясціў неза-



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

лежнасць Беларусі? З якімі падзеямі гэта звязана? *(25 жніўня 1991 г., 8 снежня 1991 г.)*

Падчас гутаркі настаўнік разам з вучнямі высвятляюць храналогію падзей, звязаных з гісторыяй утварэння ССРБ (БССР), СССР. Даецца гістарычная ацэнка гэтым дзяржаўным утварэнням. Вучні адказваюць на пытанні: Чаму і пры якіх абставінах распаўся СССР? Чаму была абвешчана незалежнасць Беларускай ССР? На працягу гэтай гутаркі могуць быць выказаны ацэнкі дзейнасці некаторых гістарычных асоб: М.Гарбачова, Б.Ельцына, Л.Краўчука, С.Шушкевіча, В.Кебіча.

**II.** Пры разглядзе другога пытання ўрока настаўнік тлумачыць вучням паняцце *"палітычная сістэма"*. Гэта сістэма дзяржаўных і недзяржаўных сацыяльных інстытутаў, якія ажыццяўляюць пэўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя функцыі. Неабходна падкрэсліць, што палітычныя сістэмы бываюць адкрытыя і закрытыя. Для адкрытай сістэмы характэрны дынамічная структура і шырокія ўзаемасувязі з грамадствам і суседнімі дзяржавамі. Закрытая сістэма мае жорстка фіксаваную структуру і мінімальную сувязь з грамадствам і суседскімі дзяржавамі. Менавіта закрытай палітычнай сістэмай характарызаваўся СССР і ўсе яго састаўныя часткі, у тым ліку і БССР. Толькі з распадам СССР і ліквідацыяй манапольнай улады КПСС у канцы 1980-х гг. пачаўся пераход да адкрытай палітычнай сістэмы. *(Настаўнік разам з вучнямі вызначае, што адрозніваe палітычную сістэму Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе ад палітычнай сістэмы БССР).*

Пры абмеркаванні пытання аб палітычнай сістэме Рэспублікі Беларусь неабходна адзначыць, што ключавым момантам яе абнаўлення стала прыняцце 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**III.** Па трэцяму пункту плана ўрока праводзіцца гутарка па пытаннях:

1. Чаму менавіта Канстытуцыя мае рашаючае значэнне для існавання дзяржавы?

2. Калі і пры якіх абставінах была прынята першая Канстытуцыя ССРБ?

3. Якія важнейшыя заканадаўчыя акты папярэднічалі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? Пры якіх абставінах яны былі прыняты?

4. Чым адрозніваецца Канстытуцыя БССР 1978 г. ад Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, прынятай Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 г.?

5. Хто ўзначальваў урад Рэспублікі Беларусь у 1991—1994 гг.?

6. Калі і якім заканадаўчым актам была ўведзена пасада Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?

Настаўнік дае вучням кароткую характарыстыку палітычнай сітуацыі напярэдадні першых прэзідэнцкіх выбараў. Неабходна адзначыць, што ў Беларусі на той момант даволі моцнымі былі пазіцыі тых палітычных сіл, якія на першых прэзідэнцкіх выбарах зрабілі стаўку на З.Пазняка (старшыню Беларускага народнага фронту). Больш памяркоўную пазіцыю займаў дэмакрат С.Шушкевіч. Левае крыло прадстаўлялі камуніст В.Новікаў, старшыня Савета Міністраў В.Кебіч і А.Дубко (прадстаўнік Аграрнай партыі). Пра незалежнасць ні ад якіх палітычных партый заяўляў дэпутат Вярхоўнага Савета А.Лукашэнка.

26 чэрвеня 1994 г. прайшоў першы тур прэзідэнцкіх выбараў. Па выніках галасавання А.Лукашэнка набраў амаль што 40% галасоў выбаршчыкаў. На другім месцы аказаўся старшыня Савета Міністраў В.Кебіч, які набраў каля 20% галасоў.

Другі тур прэзідэнцкіх выбараў адбыўся 10 ліпеня 1994 г. Перамогу атрымаў А.Лукашэнка, які атрымаў больш за 80% галасоў выбаршчыкаў.

**IV.** Праводзіцца гутарка з вучнямі па наступных пытаннях:

1. Калі ў Беларусі з'явілася нацыянальная сімволіка? З якімі падзеямі гэта было звязана?

2. Пры якіх абставінах у пачатку 1990-х гг. змяніліся дзяржаўныя сімвалы Беларусі?

3. Якая мова была зацверджана заканадаўчымі дакументамі ў Беларусі ў якасці дзяржаўнай у пачатку 1990-х гг.? Да якіх праблем гэта прыводзіла?

4. Якія найбольш вострыя праблемы праяўляліся ў эканоміцы БССР і Рэспублікі Беларусь у 1988—1994 гг.?

Настаўнік падводзіць вучняў да вываду, што многія праблемы падштурхнулі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнку да правядзення некаторых рэформ. Так, 14 мая 1995 г. адбыўся рэспубліканскі рэферэндум, на якім былі вырашаны пытанні надання роўнага статусу двюм мовам (беларускай і рускай) у якасці дзяржаўных. Была ўведзена новая дзяржаўная сімволіка, прынята рашэнне аб эканамічнай інтэграцыі Беларусі і Расіі.

Потым гутарка працягваецца па наступных пытаннях:

1. Якія супярэчнасці ўзніклі паміж Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у 1995—1996 гг.?

2. Якія пытанні былі пастаўлены перад грамадзянамі Рэспублікі Беларусь на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г.?

Галоўнымі пытаннямі былі: перанос Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь з 27 ліпеня на 3 ліпеня (Дзень вызвалення Мінска ад нямецкіх акупантаў) і ўнясенне змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Потым настаўнік прапануе правесці прэс-канферэнцыю з "прадстаўнікамі" розных галін ула-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

ды. Пажадана, каб пытанні задаваліся вучням розных груп.

У працэсе высвятлення структуры ўлады ў Рэспубліцы Беларусь настаўнік з вучнямі афармляе на дошцы схему “Структура дзяржаўных органаў улады Рэспублікі Беларусь”.

**Структура дзяржаўных органаў улады Рэспублікі Беларусь**




**Замацаванне новых ведаў.** Пасля прэс-канферэнцыі настаўнік паказвае мультымедыйную прэзентацыю сучаснай структуры ўлады ў Рэспубліцы Беларусь *(гл. дадатак)*.

**V.** Гутарка па пытаннях:

1. Калі адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у другі раз?

2. Колькі было прэтэндэнтаў на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на другіх прэзідэнцкіх выбарах?

3. З якой перавагай у галасах перамог А.Лукашэнка?

*(Настаўнік абагульняе звесткі, атрыманыя падчас гутаркі. **9 верасня 2001 г.** адбыліся чарговыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На гэту вышэйшую дзяржаўную пасаду ў другі раз быў абраны Аляксандр Лукашэнка. За яго аддалі свае галасы 75,65% выбаршчыкаў.)*

4. Назавіце дату, калі адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь трэці раз?

5. Колькі было прэтэндэнтаў на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і чаму перамог А.Лукашэнка?

6. Чым выклікаены цяжкасці эканамічнага развіцця Беларусі на сучасным этапе?

Настаўнік абагульняе звесткі, атрыманыя падчас гутаркі, і адзначае, што **19 сакавіка 2006 г.** адбыліся чарговыя (трэція) выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. За Аляксандра Лукашэнку аддалі свае галасы 83% выбаршчыкаў.

Рэспубліка Беларусь прайшла даволі складаны шлях ад прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР да прыняцця 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. З 1991 г. Беларусь была парламенцкай рэспублікай, а пасля рэферэндуму 1996 г. яна з’яўляецца прэзідэнцкай рэспублікай.

Неабходна ў гэтай сувязі падкрэсліць, што пры парламенцкай рэспубліцы заканадаўчы орган мае шырокія паўнамоцтвы. Гэта прыводзіць да канфліктаў з выканаўчай уладай.

Пры прэзідэнцкай рэспубліцы Прэзідэнт мае шырокія паўнамоцтвы. Асаблівасцю беларускага варыянта арганізацыі ўзаемадзеяння паміж трыма галінамі ўлады з’явілася стварэнне ў 1996 г. прэзідэнцкай вертыкалі, што прывяло да ўмацавання ўсёй сістэмы выканаўчай улады.

У грамадска-палітычным жыцці створаныя ў рэспубліцы палітычныя партыі і грамадскія рухі істотнай ролі не іграюць. Гэта можна патлумачыць тым, што грамадства аказалася мала падрыхтаваным да ўвядзення шматпартыйнасці.

Настаўнік выстаўляе вучням адзнакі, атрыманыя на ўроку.

**Дамашняе заданне:** вусна адказаць на пытанні 3, 4 на с. 187 вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст.—1999 г.”.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



## Дзяржаўныя органы ўлады і кіравання ў Рэспубліцы Беларусь

- ***Заканадаўчая***
  - Нацыянальны сход
    - Савет рэспублікі
    - Палата прадстаўнікоў
- ***Выканаўчая***
  - Савет Міністраў
  - Абласныя выканкамы, Мінскі гарадскі выканкам
  - Раённыя выканкамы
  - Гарадскія выканкамы
  - Пасялковыя выканкамы
  - Сельскія выканкамы
- ***Судовая***
  - Канстытуцыйны Суд
  - Вярхоўны Суд
  - Абласныя суды, Мінскі гарадскі суд, суды гарадоў, раёнаў
  - Вышэйшы Гаспадарчы Суд
  - Мінскі гарадскі і абласныя гаспадарчыя суды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь

- Палата прадстаўнікоў, 110 дэпутатаў
  - Савет Палаты прадстаўнікоў
    - Пастаянныя камісіі палаты
    - Сакратарыят палаты
- Савет Рэспублікі, 64 члены
  - Прэзідыум Савета Рэспублікі
    - Пастаянныя камісіі палаты
    - Сакратарыят палаты

**Урад Рэспублікі Беларусь і рэспубліканскія дзяржаўныя органы, падпарадкаваныя ўраду**

- *Міністэрствы Рэспублікі Беларусь (24)*
- *Дзяржаўныя камітэты (6)*
- *Камітэты пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (7)*
- *Дзяржаўныя арганізацыі, якія падпарадкоўваюцца Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь (8)*

**Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь**

*Фарміруецца з 12 суддзяў:*
*6 назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь,*
*6 выбіраюцца Саветам Рэспублікі Нацыянальнага схода*

*Тэрмін паўнамоцтваў суддзяў — 11 год*

*Суддзёй Канстытуцыйнага Суда не можа быць чалавек старэй за 70 гадоў*



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version